■ Кантрамарка

# АД ЭТНАМЮЗІКЛА ДА ТРАГІФАРШУ

**У самы зацішны месяц тэатральнага года — жнівень — сапраўдным тэатралам толькі і застаецца, што чакаць новага сезона, прадчуваючы яго найлепшыя падзеі. Адной з іх сёлета стане II Маладзёжны тэатральны форум, які напрыканцы лістапада будзе прымаць на сваіх пляцоўках Рэспубліка Беларусь. У Мінску можна будзе пабачыць азербайджанскі этнамюзікл, літоўскую інсцэніроўку Чака Паланіка, сучасную беларускую драматургію, увасобленую на ўкраінскай сцэне, ды шмат іншага.**

## МЕСЦА ДЗЕЯННЯ: БЕЛАРУСЬ

Адразу варта зазначыць унікальнасць падзеі для беларускага тэатральнага працэсу. Нягледзячы на адносна спрыяльную сітуацыю з фестывальным рухам у нашай краіне (напрыклад, у межах «ТэАрта» гэтай восенню ў сталіцы пабачаць спектаклі Томаса Астэрмаера і Піпа Дэльбона), Маладзёжны тэатральны форум канцэнтравана прадставіць малазаўважны для беларускага гледача сегмент працэсу — найлепшыя спектаклі маладых творцаў з краін СНД, Балтыі і Грузіі.

Мэта арганізатараў (Міжнародная канфедэрацыя тэатральных саюзаў і Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД; з беларускага боку сёлета выступаюць: Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі) — аднавіць некалі трывалыя тэатральныя сувязі, стварыць прастору для камунікацыі тэатральнай моладзі і пашырыць кола магчымасцей для маладых прафесіяналаў. Першы форум паспяхова прайшоў у 2012 годзе ў Кішынёве (Малдова). Дарэчы, Гран-пры там заваявала беларуская пастаноўка нямецкай п'есы Інгрыд Лаузунд «Офіс» (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, рэжысёр — Кацярына Аверкава). Арганізатары плануюць, што форум будзе раз на два гады пераязджаць у новую тэатральную сталіцу з шэрагу краін-удзельніц.

## ШЭКСПІР У ЛЯЛЕЧНЫМ ТЭАТРЫ

З 19 па 26 лістапада на пляцоўках Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага і Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача пакажуць 13 спектакляў з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны і Эстоніі. У праграму форуму трапілі розныя віды і розныя жанры. Крытэрыямі для экспертаў-адборшчыкаў, у лік якіх увайшлі рэжысёр Уладзімір Панкоў, тэатразнаўцы Марыя Халізева і Марыя Львова ды іншыя, сталі найперш якасць пастаноўкі і ўзрост рэжысёра — да 35 гадоў.



Спектакль «Гамлет» (Магілёўскі абласны тэатр лялек).

Так што ў рамках форуму гледачы змогуць пабачыць і нацыянальны тэатр — азербайджанскі этнамюзікл «Боская гульня». І драматургічную класіку ў сучасным пераасэнсаванні — беларускі трагіфарш «Гамлет» паводле Уільяма Шэкспіра Магілёўскага абласнога тэатра лялек. І дакументальны тэатр з Малдовы — «Дзеці голаду. Сведчанні» паводле Аляксея Вакулоўскага. І трупу Лысьвенскага тэатра драмы імя Анатоля Савіна ў спектаклі «Воблака-рай», якую крытык Павел Руднеў адзначыў як адну з найлепшых у Расіі. І сучасную беларускую драматургію ва ўкраінскай тэатральнай прасторы: рэжысёр Стас Жыркоў паставіў п'есу беларускага драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага «Любоў людзей» у Кіеўскім акадэмічным Маладым тэатры. І інсцэніроўку сучаснай сусветнай літаратуры як прыклад паспяховай капрадукцыі маладой тэатральнай групы і Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Літвы — «Байцоўскі клуб» паводле Чака Паланіка.

У склад тэатральных дэлегацый ад краін-удзельніц таксама ўвойдуць драматургі, сцэнографы і крытыкі. У рамках форуму будзе прэзентаваны зборнік маладой драматургіі і пройдуць чыткі асобных тэкстаў. Найлепшыя ўзоры мастацтва сцэнаграфіі можна будзе пабачыць на выставе. А крытыкі традыцыйна будуць ладзіць адкрытыя абмеркаванні спектакляў.

## НЕАБМЕЖАВАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Акрамя панарамнага погляду на творчасць тэатральнай моладзі краін СНД, Балтыі і Грузіі, форум прапануе ўдзельнікам і магчымасць пазмагацца за матэрыяльную падтрымку. Паказы спектакляў адбываюцца на конкурснай аснове. Пераможца, якога вызначае прафесійнае журы, атрымлівае грашовы прыз, а таксама магчымасць выйсці на новы ўзровень і паказаць сваю работу ў праграме аднаго з вядучых сусветных тэатральных фестываляў — Міжнароднага тэатральнага фестываля імя А.П. Чэхава.

Дарэчы, водгалас І Маладзёжнага тэатральнага форуму ў беларускай тэатральнай прасторы досыць адчувальны. Спектакль «Офіс» займеў прыкметную гастрольную гісторыю. У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ў капрадукцыі Расія—Беларусь—Кыргызстан пастаўлены спектакль «Ціхі шоргат сыходзячых крокаў» Дзмітрыя Багаслаўскага: Міжнародная канфедэрацыя тэатральных саюзаў падтрымала ідэю запрасіць на пастаноўку сучаснай беларускай п'есы ўдзельніка форуму, маладога кыргызскага рэжысёра Шаміля Дыйканбаева. А магілёўскі Міжнародны маладзёжны форум «Март-кантакт» наладзіў трывалыя творчыя стасункі з Ераванскім дзяржаўным тэатрам лялек імя Аванэса Туманяна. Усё гэта дазваляе спадзявацца, што паказы і сустрэчы і ў рамках другога форуму перарастуць у цеснае творчае сяброўства і супрацоўніцтва. А тэатральныя падзеі і падчас форуму, і пасля яго заканчэння пацвердзяць значнасць і плённасць ідэі яго правядзення.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

---

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# КАЛІ І ЯК КАПАЦЬ БУЛЬБУ

**Вось і жнівень набліжаецца да канца — час капаць бульбу. Быццам бы, справа гэтая няхітрая, хоць і працаёмкая. Але ў ёй, аказваецца, таксама ёсць свае важныя «дробязі» і хітрасці, якія могуць паўплываць на якасць нашага ўраджаю і на яго захоўванне.**

## ЯК ДАВЕДАЦЦА, ШТО ЧАС ПРЫЙШОЎ

На фактычнае паспяванне клубняў уплывае і тэрмін пасадкі, і гатунак, і кліматычныя ўмовы, і асаблівасці догляду.

Самая відавочная і надзейная прыкмета — адміранне і засыханне бульбоўніку. Калі гэта адбылося, трымаць клубні ў глебе далей сэнсу няма. Пасля таго як бацвінне звяла, максімальна магчымы тэрмін, на працягу якога клубні могуць заставацца ў зямлі, — тры тыдні. Калі спазніцца з уборкай саспелай бульбы, захоўвацца ўраджай будзе значна горш.

**Насенную бульбу пасля ўборкі нядрэнна празеляніць — патрымаць на святле, пакуль клубні не пазелянеюць. Так яны і захоўваюцца лепш, і грызуны на іх не кваляцца.**

Халады набліжаюцца, а бацвінне стаіць зялёненькае? Глядзім на надвор'е. Калі прыйшлі раннія замаразкі, пашкодзілі парасткі, адкладаць уборку нельга: расліна будзе спрабаваць аднавіць лістоту за кошт пажыўных рэчываў, назапашаных у клубнях.

Некаторыя гаспадары скошваюць бульбоўнік перад уборкай. У якіх выпадках гэта мэтазгодна, і як правільна гэта зрабіць? Скошваць яго ёсць сэнс у тым выпадку, калі тэрміны ўборкі падыходзяць, а бульбоўнік працягвае расці (так здараецца, напрыклад, пры позняй пасадцы). Робіцца гэта, каб паскорыць паспяванне клубняў, што можа быць важна на парозе надыходзячых халадоў. Толькі праводзіць падобнае мерапрыемства трэба загадзя: не варта скошваць парасткі непасрэдна перад уборкай — дайце расліне 7-10 дзён на завяршэнне ўсіх біялагічных працэсаў.

Калі на бульбу напала фітафтора, бацвінне таксама варта скасіць і неадкладна знішчыць. Клубні ў гэтым выпадку пакідаюць у зямлі на тэрмін да 3 тыдняў, каб яны паспелі цалкам выспець і ўтварыць дастаткова трывалую лупіну, якая не будзе пашкоджвацца пры ўборцы.

На паспяванне бульбы таксама ўплываюць:

- ***урадлівасць глебы:*** чым бяднейшая зямля на пажыўныя рэчывы, тым раней наступіць час капаць бульбу — на ўрадлівых, добра ўгноеных участках рост клубняў можа працягвацца да глыбокай восені;
- ***колькасць вільгаці:*** яе дэфіцыт на працягу вегетацыйнага перыяду паскорыць паспяванне бульбы, таму ў засушлівае лета на ўчастках без паліву мы бачым бульбоўнік, які рана высах (праўда, ураджай у гэтым выпадку нярэдка засмучае);
- ***высокія дозы ўгнаенняў:*** вялікая колькасць унесенай пад бульбу арганікі падаўжае тэрмін паспявання (і, дарэчы, можа павялічыць ўтрыманне нітратаў у клубнях, асабліва калі прыступіць да ўборкі заўчасна).

Плануючы ўборку бульбы, варта ўважліва сачыць за прагнозам:

- нельга зацягваць з уборкай, калі чакаюцца працяглыя дажджы: пераўвільгатненне глебы правакуе хваробы клубняў, гніль, пагаршае стан пры захоўванні, капаць бульбу з наліплай на яе зямлёй таксама не надта лёгка і прыемна;
- аптымальная тэмпература паветра для ўборкі бульбы — не вышэй за +17 градусаў, але не ніжэй як +10: холад можа стаць прычынай пачарнення клубняў;
- найлепш за ўсё капаць бульбу ў пагодны дзень, калі клубні можна падсушыць на паветры, а глеба добра чысціцца і не ліпне;
- увосень не рэкамендуюць капаць бульбу раніцай, калі астылае за ноч паветра нашмат халаднейшае за глебу, якая яшчэ захоўвае летняе цяпло;
- цалкам завяршаць уборку ўраджаю варта да надыходу ўстойлівых замаразкаў, якія здольны пашкодзіць не толькі бацвінне, але і клубні ў зямлі.



## ЧЫМ КАПАЦЬ, ЯК КАПАЦЬ

Адны ўпэўнены: капаць трэба толькі віламі, таму што лапатай лягчэй пашкодзіць бульбу. Кожны, хто спрабаваў гэта рабіць, памятае, як яно бывае: стараешся як мага акуратней падкапаць куст, але не-не, ды і пачуеш характэрны хруст — вострае лязо рассекла чарговы клубень. Што крыўдна — пакутуюць найчасцей адборныя, буйныя бульбіны. Значыць, вілы лепш?

Віламі можна выкапаць гняздо, не пашкодзіўшы яго, і зямля на іх не затрымліваецца, як на лапаце. З іншага боку, каму не даводзілася насадзіць клубень на лязо? Такое таксама здараецца. Дык вось, прыхільнікі выкарыстання лапаты сцвярджаюць: зроблены ёй востры зрэз на паветры хутка заветрыцца, і бульбіна можа яшчэ некаторы час захоўвацца, а з праколам ад вілаў падобнае немагчыма.

Як капаць — залежыць ад глебы. На друзлай, добра апрацаванай — досыць бывае акуратна пацягнуць за астаткі бульбоўніка, сабраць клубні, выбраць тыя, што засталіся ў зямлі, і капнуць лапатай або віламі, каб пераканацца, ці не засталіся тыя, што зарыліся глыбей. А на шчыльнай глебе варта папярэдне падкапаць куст збоку, імкнучыся не пашкодзіць клубні.

Вельмі пажадана адразу адбіраць пасадачны матэрыял — здаровыя клубні сярэдняга памеру з найлепшых кустоў. Іх адкладаем, імкнучыся не змешваць гатункі. Насенную бульбу пасля ўборкі нядрэнна празеляніць — патрымаць на святле, пакуль клубні не пазелянеюць. Так яны і захоўваюцца лепш, і грызуны на іх не кваляцца.

Калі надвор'е дазваляе, не варта адразу складваць выкапаныя клубні ў мяшкі. Пакіньце іх на зямлі на пару гадзін, рассыпаўшы тонкім слоем. За гэты час бульба злёгку падсохне і атрымае неабходную апрацоўку ўльтрафіялетам. Караткачасовае ўздзеянне сонечнага святла, на думку спецыялістаў, дапамагае абеззаразіць клубні і прадухіліць развіццё хвароб пры захоўванні. Толькі не перашчыруйце — не забывайце, што пры працяглым знаходжанні на святле бульба зелянее, у ёй выпрацоўваецца яд — саланін, які нам зусім не патрэбны.

Потым выкапаную бульбу сартуем: адбіраем дробныя, пашкоджаныя пры ўборцы, хворыя клубні. Нешта давядзецца проста выкінуць, штосьці пойдзе на корм птушкам або свойскай жывёле (у каго яна ёсць), а бульбу з невялікімі пашкоджаннямі ўжывайце ў першую чаргу.

Улічыце: пры выкопванні, сушцы, сартаванні і ўборцы вельмі непажадана лішні раз перасыпаць, кідаць клубні — абыходзіцца з імі варта беражліва, гэта падоўжыць тэрмін захоўвання.

Але нават прасушаная на полі бульба абавязкова павінна прайсці так званы рэабілітацыйны перыяд.

**Скошваць бульбоўнік трэба загадзя, а непасрэдна перад уборкай — дайце расліне 7-10 дзён на завяршэнне ўсіх біялагічных працэсаў.**

Па-першае, далёка не ўсе праблемы можна заўважыць адразу: часам хвароба клубня праяўляецца праз нейкі час. Калі гэта адбываецца ўжо пры захоўванні, высокая верагоднасць заражэння суседніх бульбін. Падчас рэабілітацыйнага перыяду такія скрытыя хваробы часцяком выяўляюць сябе, і пашкоджаная бульба выдаляецца. Па-другое, бульба, змешчаная ў адпаведныя ўмовы, даспявае, у яе падсыхае і становіцца больш жорсткай лупіна, забяспечваючы лепшую захоўваемасць, ды і смак клубняў выйграе. А якія патрэбны ўмовы? Абавязкова — высокая вільготнасць паветра (90-95%), аптымальная тэмпература — каля 18 градусаў, але яе паніжэнне да + 13 —10 градусаў не крытычна, абы не павышалася. У такіх умовах раяць вытрымліваць бульбу прыкладна месяц-паўтара. Клубні пры гэтым могуць знаходзіцца ў скрынях або россыпам (калі ў мяшках, то лепш сеткаватых, каб была добрая вентыляцыя). І толькі потым прыбіраем іх канчаткова — на зімовае захоўванне.

Працаёмка? Магчыма... Але вынік варты таго.

---

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ПЛОТ, агароджа, тын — часцей за ўсё драўляная агароджа падворка і хаты, якая стала сімвалічнай мяжой, падзяляла «сваю» і «чужую» прасторы і ўказвала на засвоеную тэрыторыю. Плотам абавязкова абносілі могілкі, загоны для жывёлы. У даўнія часы агароджай з вялікіх бярвёнаў (валам, сцяной) абносілі ўсю вёску ці горад, што часам было адзінай аховай ад ворагаў.

◈ Плот быў надзелены статусам цэласнасці і недатыкальнасці. Таму выхад не праз вароты ці злом плота параўноўвалі з пазашлюбнымі адносінамі: «Хата без плота, што баба без мужыка», «Вяселле пад плотам, а вянчанне потым», «хадзіць з дзіркай у плоце» — значыць страціць цнатлівасць па-за шлюбам, «ісці за плот» — зрабіць аборт. Дзіця, якое нараджалася па-за шлюбам, звалі «падзаборным».

◈ Цяжарнай жанчыне забаранялася пералазіць праз плот, каб «не выкінуць», страціць дзіця. У той жа час, калі роды былі цяжкімі, мужу раілі знесці або разламаць частку плота. Лічылася, што такія магічныя дзеянні паспрыяюць хуткаму нараджэнню дзіцяці.

◈ На плоце ніколі не сушылі дзіцячае адзенне, пялёнкі. Меркавалі, якімі рэдкімі былі штакеціны, такімі рэдкімі вырастуць зубы і валасы дзіцяці.

◈ У традыцыйнай культуры ўсходніх славян плот набыў статус небяспечнага, «нячыстага», але ў той жа час сакральнага месца ці рэчы. Пад плот (самую яго аддаленую ад жылых памяшканняў частку) вылівалі ваду пасля абмывання нябожчыка; а таксама ў якой пралі бялізну. Пад агароджай могілак хавалі нехрышчоных і незаконнанароджаных дзяцей, «задушных» нябожчыкаў (самазабойцаў, тапельцаў і г.д.).

◈ Травой, сабранай пад плотам, а значыць, той, якую ніхто не кранаў і па якой хадзілі людзі, народныя лекары лячылі людзей і хатнюю жывёлу.

◈ Каля плота абмывалі людзей, якія хварэлі «падучай» хваробай. Пад плотам закопвалі рытуальныя рэчы, на якія «адсылалі» хваробы і няшчасці. Каб пазбавіць дзіця ад сурокаў, пад плотам рабілі лаз і прымушалі хворае дзіця некалькі разоў пралезці ў яго.

◈ На плот вешалі рытуальныя рэчы, якія з'яўляліся абярэгам для ўсёй гаспадаркі, напрыклад старыя лапці, бітыя гліняныя гаршкі, траецкія і купальскія травы і г.д. Часам на плот вешалі чэрапы кароў ці быкоў, падчас калядавання — чучала, якое сімвалізавала сквапнасць ці злоснасць гаспадароў хаты.

◈ Плот быў асноўным «удзельнікам» варажбы на Раство. Дзяўчаты перакідвалі праз плот боты і жадалі даведацца: у якім баку жыве нарачоны. Яны абхаплівалі плот і варажылі: возьмуць шлюб у гэтым годзе ці не. Цотная колькасць слупоў прадказвала «пару», няцотная — адзіноту. Дзяўчаты позна ўвечары выходзілі на вуліцу і ішлі ўздоўж суседскага плота, часам заходзячы за самы край. Пры гэтым казалі: «Пара — не». Ці так: «Маладзец, удавец...».

---

*Яшчэ не верасень, але*
*Пажоўклы ліст —*
*вандроўнік вечны —*
*Каля шашы*
*ля Маладзечна*
*Ляціць пад колы*
*«Шэўрале».*
*Яшчэ не верасень, аднак*
*Над аўтастрадай*
*птах кружляе,*
*Нібыта з высі пасылае*
*Растання восеньскага*
*знак.*
*Яшчэ не верасень, таму*
*Імчу па жніўні*
*з весялосцю...*
*А колькі лета засталося —*
*Вядома небу аднаму.*




---

Даты Падзеі Людзі

**26 ЖНІЎНЯ**

**1382** год — хан Тахтамыш захапіў і спаліў Маскву. У 1377 годзе ён пры падтрымцы Тамерлана прыступіў да заваявання Залатой Арды. Увесну 1378-га, пасля падзення ўсходняй часткі са сталіцай у Сыгнаку, Тахтамыш уварваўся ў заходнюю частку, якую кантраляваў Мамай. Да красавіка 1380 года ён здолеў захапіць ўсю Залатую Арду аж да Азова, уключаючы сталіцу — Сарай. У 1382-м Тахтамыш з вялікім войскам пайшоў на Маскву. 24 жніўня 1382 года ён падышоў да сталіцы. Вялікі князь маскоўскі Дзмітрый Данской збіраў у той час раць у паўночных рускіх землях. Абаронай Масквы кіраваў юны літоўскі князь Асцей. Два дні масквічы ўпарта абараняліся. Тады Тахтамыш вырашыў узяць Маскву хітрасцю, паслаўшы на перамовы ніжагародскіх князёў Васіля Кірдзяпу і Сямёна Дзмітрыевіча. Князі пакляліся, што Тахтамыш памілуе масквічоў, калі яны здадуцца. 26 жніўня 1382 года масквічы адкрылі вароты. Каварны хан, вядома, свайго абяцання не стрымаў. Мноства людзей было перабіта, горад быў разрабаваны. Пасля гэтага татары ўзялі Пераяслаўль, Уладзімір, Юр'еў, Звянігарад, Мажайск і іншыя падмаскоўныя гарады, абклаўшы іх цяжкай данінай.



**1880** год — 135 гадоў таму нарадзіўся (г. Рым) Апалінэр Гіём (Вільгельм Апалінарый Кастравіцкі), французскі паэт. Род паэта беларускага паходжання — Кастравіцкія валодалі маёнткам Даршковічы пад Навагрудкам. Пасля паўстання 1863-1864 гг. маёнтак быў канфіскаваны, дзед Гіёма эмігрыраваў у Італію, там і прайшлі дзяцінства і юнацтва паэта. З 1899 года Апалінэр у Парыжы. Удзельнік Першай сусветнай вайны. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1901-м. У многіх творах паэта прасочваецца духоўная сувязь са славянскімі краінамі (раман «Жанчына ў крэсле», апавяданне «Сустрэча ў Празе» і інш.). Большасць твораў апублікавана пасмяротна. Пры жыцці выйшлі зборнікі «Алкаголь. Вершы 1898-1913», «Каліграмы. Вершы Вайны і Міру» і некаторыя іншыя. Шырокую вядомасць атрымаў раман Апалінэра «Жанчына». На беларускую мову творы паэта перакладала Э. Агняцвет (зборнік «Зямны акіян»). Памёр у 1918 годзе.

**1940** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Куранец Вілейскага раёна) Анатоль Яўхімавіч Арцімовіч, беларускі скульптар, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2013). У 1966 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, выкладае ў Беларускай акадэміі мастацтваў. Працуе ў галіне манументальнай і мемарыяльнай скульптуры. Адзін са стваральнікаў Кургана Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі, мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1999).

Было сказана

**Максім БАГДАНОВІЧ, паэт:**
*Рупная пчала*
*Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак.*

---

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.06 | 20.15 | 14.09 |
| Віцебск | — 5.53 | 20.08 | 14.15 |
| Магілёў | — 5.56 | 20.05 | 14.09 |
| Гомель | — 5.57 | 19.59 | 14.02 |
| Гродна | — 6.22 | 20.33 | 14.11 |
| Брэст | — 6.26 | 20.27 | 14.01 |

## Месяц

*Поўня 29 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

***Пр.*** *Аляксея, Васіля, Максіма, Мікалая.*
***К.*** *Марыі, Тэрэзы, Віктара, Канстанціна.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



# ЗАЎТРА




---

УСМІХНЕМСЯ

**Купіла сабе трусы, а мужу кашулю, цэннікі памяняла месцамі... Знерваваўся, кажа, што дарагую кашулю купіла.**

— Зноў п'еш?
— У мяне стрэс.
— У цябе праз дзень стрэс!
— Я ранімы.

**Заварыў кітайскі чай. Сяджу, атрымліваю асалоду. У галаву прыходзяць думкі старажытных кітайскіх мудрацоў... Шкада, па-кітайску нічога не разумею.**

Жонка — мужу:
— Калі цябе сашлюць у Сібір, я, вядома, паеду разам з табой, але футра трэба купіць загадзя.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3309.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 жніўня 2015 года.